способствует человеческому прогрессу тем или иным образом. Это так не потому, что китайцы претенциозны больше других, а потому, что в соответствии с конфуцианством политические проблемы являются этническими проблемами. Хотя это, правда, что великие державы и революционные режимы любят думать о своей внешней политике в плане большой морали, поведение Китая, по меньшей мере, частично является производным от конфуцианской традиции.

Таким образом, в период правления Мао Цзэдуна конфуцианство, несмотря на категорическое отрицание его со стороны КПК, имело существенное влияние на внешнюю политику страны. Более того, Мао Цзэдуном и его сторонниками были заимствованы древние, феодальные, китаецентрические и изоляционистские воззрения в стремлении реализовать концепцию «Китай-варвары», использовать принцип «руками варваров подавлять варваров», возродить величие имперского Китая.

## АБ НЕКАТОРЫХ МОМАНТАХ ЗНЕШНЕПАЛІТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ КАРОНЫ ПОЛЬСКАЙ І ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVI – XVII ст.

**С. А. Лашкевіч**

Доўгі час у гістарычнай навуцы лічылася, што пасля падпісання Люблінскай уніі ў 1569 г. дыпламатычная служба Княства як і наогул дыпламатыя перастала існаваць. Дыпламатычныя захады ВКЛ ў другой палове XVI ст. – першай палове XVII ст. атаясамліваліся са знешняй палітыкай і дыпламатыяй Польскай Кароны, тым самым як бы падкрэсліваючы несамастойнасць, падпарадкаванасць польскім уплывам міжнароднай палітыкі ВКЛ.

Рэальныя факты аднак абвяргаюць гэтыя сцвярджэнні. Пасля падпісання Люблінскай уніі ўзаемадачыненні паміж ВКЛ і Польшчай у значнай ступені заставаліся такія ж, як і пры персанальных уніях да 1569 г. Адасобленасць урадаў, у тым ліку ведамстваў замежных спраў, фінансаў, войска і, галоўнае, тэрыторыяў, захоўвалася. Кожная з дзяржаваў Рэчы Паспалітай асобна абараняла свае межы, а істотныя праблемы знешняй палітыкі заставаліся часта ўласнымі праблемамі ВКЛ ці Польшчы. Княства на працягу разглядаемага перыяду праводзіла актыўную і самастойную знешнюю палітыку. Іншая справа, што ўнія з Польшчай унесла пэўныя карэктывы ў знешнепалітычную дзейнасць краіны. Польшча і ВКЛ, маючы сумеснага манарха, мусілі каардынаваць свае дзеянні на міжнароднай арэне.

Начале дыпламатычнай службы ВКЛ, як і Польшчы, ў гэты час стаяў манарх, знешнепалітычныя паўнамоцтвы якога паступова страчвалі сваю моц. Адначасова ў міжнародных адносінах павышаецца роля агульнадзяржаўнага сойма, і ў прыватнасці, сената, які ў часы «бескаралеўя» фактычна ўзначальвае дыпламатычную службу краіны. У другой палове XVI ст., пасля праведзеных унутрыдзяржаўных рэформаў у ВКЛ, павышаецца роля павятовых соймікаў, дзе дэпутаты мелі права абмяркоўваць пытанні вайны і міру, і даводзіць сваю пазіцыю праз паслоў на агульнадзяржаўны, вальны сойм. У выніку соймавых пастаноў другой паловы XVI ст. – пачатку XVII ст. павышаецца роля гетманаў ў міждзяржаўных адносінах. Да іх кампетэнцыі адыходзяць паўнамоцтвы вядзення дыпламатычных перамоў у выніку пагрозы ці пад час вайны.

У складзе Рэчы Паспалітай (РП) паміж Каронай і Княствам склалася даволі выразнае размеркаванне знешнепалітычных абавязкаў і паўнамоцтваў. Гэта выцякала з розных дзяржаўна-палітычных інтарэсаў абедзвюх краінаў, што ў сваю чаргу абумоўлена іх розным геапалітычным становішчам. Адносіны з Турцыяй, Крымскім ханствам, Персіяй, Ватыканам, еўрапейскімі дзяржавамі знаходзіліся ў руках Кароны. Да кампетэнцыі Княства належалі дыпламатычныя справы з Маскоўскай дзяржавай і часткова Швецыяй. Адпаведным чынам была арганізаваная дыпламатычная служба РП. Улады Кароны і Княства высылалі паслоў у замежныя пасольствы ад імя ўсёй РП, духоўных і свецкіх уладаў. Звычайна дэлегацыі фармаваліся соймам РП, які ўлічваў знешнепалітычныя прыярытэты Кароны альбо Княства.

Падзел дыпламатычнай працы паміж Каронай і Княствам адбіваўся ў практыцы апячатвання дыпламатычных дакументаў. Пасольскія паўнамоцтвы, інструкцыі, дыпламатычныя лісты і іншыя дакументы выдаваліся праз канцылярыі Кароны ці Княства і мелі адпаведныя пячаткі абедзвюх дзяржаваў. Прыкладна на працягу аднаго стагоддзя пасля 1569 г. кіруючыя асобы Княства пільна сачылі за захаваннем такой практыкі і хутка рэагавалі на выпадкі такога парушэння. Калі ў 1637 г. лісты з Рэчы Паспалітай у Маскву былі апячатаныя толькі кароннай пячаткай, гэта выклікала незадавальненне канцлера Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ) Станіслава Радзівіла.

Асаблівая значнасць у ВКЛ, як і ў РП, надавалася дачыненням з Расійскай дзяржавай, што прывяло да ўзнікнення практыкі двайнога кіраўніцтва пасольствамі, якія накіроўваліся ў Маскву: польскую дэлегацыю ўзначальваў прадстаўнік Кароны, а ліцвінскую – прадстаўнік Княства. Абодва паслы мелі аднолькавыя тытулы і паўнамоцтвы, што ўказвалася ў выдадзеных інструкцыях і вярыцельных граматах. У

дачыненнях з Масквою паслы і камісары ВКЛ у складзе адзінай дэлегацыі РП звычайна мелі колькасную і службовую перавагу над калегамі з Польшчы. Але такое становішча існавала толькі да сярэдзіны XVII ст.

Выдаткі на дыпламатычную дзейнасць Польшча і Літва неслі асобна. Скарб Кароны не фінансаваў дзейнасці паслоў і камісараў з ВКЛ, якія выязджалі ў Маскву ці ўдзельнічалі ў камісіях па ўрэгуляванні пагранічных праблемаў. Гэта належала да абавязкаў скарбу Княства.

Да сярэдзіны XVII ст. ВКЛ праводзіла самастойную знешнепалітычную лінію ў складаных дыпламатычных дачыненнях паміж Польшчай, Швецыяй і Расіяй. Польскія гісторыкі называюць гэты перыяд часамі «літоўскага сепаратызму», паколькі для кіруючых колаў ВКЛ інтарэсы Княства стаялі значна вышэй за інтарэсы федэратыўнай Рэчы Паспалітай. Пасля падпісання Статута ВКЛ 1588 г., дзе не згадвалася пра унію з Польшчай і абвяшчалася праграма аднаўлення ранейшых межаў Княства, не толькі фактычна, але і юрыдычна была прызнана адасобленнасць ВКЛ ад Польшчы.

Адным з галоўных прыярытэтаў дыпламатыі Княства з'яўляўся ўсходні накірунак. Як і ў першай палове XVI ст., так і ў разглядаемы перыяд Маскоўская дзяржава лічылася галоўнай праблемай Літоўска-беларускай канцылярыі. Яна вырашалася рознымі шляхамі. У ВКЛ былі як прыхільнікі заключэння саюзу з Масквой, што ішло ў разрэз з Люблінскімі пагадненнямі, так і прыхільнікі вайны. Ужо ў 1573 г. адбылося першае сур'ёзнае парушэнне Люблінскай уніі з боку ВКЛ, калі прадстаўнікі Княства без згоды з палякамі прапанавалі маскоўскаму цару Фёдару Іванавічу сваю падтрымку ў заняцці прастола РП пры ўмовах вяртання ВКЛ захопленных тэрыторый падчас вайны. У будучым практыка запрашэння рускіх цароў на дзяржаўны прастол РП з боку прадстаўнікоў ВКЛ працягвалася, выкарыстоўваючы тым самым дыпламатычны націск на Польшчу з мэтаю адстаяць сваю знешнепалітычную незалежнасць і мець больш варыянтаў для дыпламатычнай гульні.

Другім па значнасці прыярытэтам у знешнепалітычнай дзейнасці ВКЛ з'яўлялася Швецыя. Практыка паказала, што як толькі справа даходзіла да страты дзяржаўнай самастойнасці ВКЛ, шляхта рабіла ўсё магчымае каб гэтага не адбылося. Яскравым прыкладам гэтага з'яўляецца заключанае ў аднабаковым парадку перамір'я са Швецыяй падчас вайны 1627 г. Што датычацца Кейданскай уніі 1655 г., то тут наогул прадугледжвалася разарваць унію з Польшчай і заключыць унію са Швецыяй. Такая пазіцыя ВКЛ не магла спрыяць адзінаму знешнепалітычнаму курсу Рэчы Паспалітай. З другога боку, такія знешнепалі-

тычныя акцыі засведчылі ўсю шматграннасць незалежніцкіх памкненняў дыпламатыі Княства.

Вайна Рэчы Паспалітай з Расіяй 1654–1667 гг. стала даволі выразнай мяжой, якая адзначыла заняпад міжнародна-палітычнай актыўнасці Княства і ўзмацненне пазіцый Кароны ў складзе федэрацыі. Пасля яе польскія кіруючыя колы ўсё больш адкрыта пачалі атаясамліваць інтарэсы Кароны з інтарэсамі ўсёй Рэчы Паспалітай. Гэта тлумачыцца тым, што некалі магутная ў эканамічным плане дзяржава атрымала сур'ёзную паразу ў вайне з Расіяй. Як вядома галоўным тэатрам ваенных дзеянняў была тэрыторыя ВКЛ. На гэты раз Княству спатрэбіцца каля трох дзесяцігоддзяў каб узнавіць сваю эканоміку, але Паўночная вайна зноў адкінула яе на некалькі гадоў назад.

Апошняй значнай спробай адстаяць свае знешнепалітычныя інтарэсы ў XVII ст. была пазіцыя прадстаўнікоў ВКЛ на перамовах з Расіяй 1686 г. Хаця пазіцыя Княства не была адстаяна і землі ВКЛ перайшлі пад уладу Расіі, але захады па змякчэнню ўмоў «вечнага міру» з'яўляюцца яскравым прыкладам мужнасці і імкнення да незалежнасці.

Такім чынам, арганізацыя дыпламатычнай службы РП улічвала неаднароднасць знешнепалітычных інтарэсаў Кароны і Княства, розную накіраванасць іхных геапалітычных інтарэсаў. Разам з тым па меры ўзмацнення пазіцый польскай магнатэрыі і аслаблення ўплыву ліцвінскай арыстакратыі на справы РП адбывалася цэнтралізацыя знешнепалітычнай дзейнасці ўсёй канфедэрацыі, якая пры гэтым усё больш станавілася падобнай да федэрацыі. Носьбітам цэнтралізатарскай палітыкі ў Рэчы Паспалітай былі прадстаўнікі Польшчы. Так РП як агульная дзяржава абодвух народаў ператварылася ў Польскую Рэч Паспалітую. Напрыканцы XVII ст. гэта праяўлялася вельмі выразна. Дыпламатыя Княства страціла свой галоўны прыярытэт – дачыненні з Расіяй, якія, як паказалі перамовы 1686 г. пра «вечны мір», перайшлі ў кампетэнцыю польскай дыпламатыі.

## ЭТНОНАЦИОНАЛИЗМ В ТЕОРИИ МЕЖДУНАРОДНЫХ ОТНОШЕНИЙ

**А. Л. Лучникова**

Последнее десятилетие изучению проблем национализма придается все большее значение. На сегодняшний день национализм является одним из важнейших факторов международных отношений. При этом все чаще явление национализма ассоциируется с проявлениями активности этнических меньшинств, а сам национализм приобретает формы этнона-